Да 80-годдзя з дня нараджэння нашага паэта-земляка Пятра Прыходзькі

## ПІСЬМО ПАЭТА

*Добры дзень, дарагія землякі! Як вам жывецца, працуецца? Вельмі прыемна было даведацца з прэсы і тэлеперадач, што на Хоцімшчыне аднoўлены Свята-Троіцкі сабор у гарадскім пасёлку. Калісьці яшчэ малым я з дзедам хадзіў у гэту царкву на ўсяношную, і вось яна зноў пачала функцыяніраваць.*

*Добра тое, што наш раён не закранула новая стыхія. Вельмі рады за ўсіх сваіх землякоў, іх поспехі ў працы і жыцці.*

*Ніколі не забуду тыя дні, калі ў Хоцімску адзначалі маё 70-годдзе. Прайшлі годы, а нібыта было гэта ўчора.*

*Пасылаю вам некалькі старонак новага матэрыялу, каб напомніць пра сябе.*

*Жадаю вам, дарагія землякі, усяго найлепшага.*

**Ваш Пятро ПРЫХОДЗЬКА.**

ПЯТРО ПРЫХОДЗЬКА

# Ля вытокаў радзімы

**Паводле аднаго народнага падання, змешчанага ў "Віленскім календары" за 1910 г.**

На карце Беларусі ў вярхоўі ракі Бесядзь, што бярэ пачатак у нетрах Смаленшчыны, абапал яе раскінуўся гарадскі пасёлак Хоцімск – былое правінцыйнае мястэчка. Тут, у ціхім кутку беларускай зямлі, далёка ад чыгунак, паміж глухіх балот і лясоў, амаль упрытык да гарадскога пасёлка, прытулілася мая родная вёска Альшоў. У ёй я нарадзіўся і выхоўваўся ў дзеда і бабулі Прруднікавых, вучыўся ў пачатковай школе. Першай настаўніцай маёй была родная маці Аркадзя Аляксандравіча Куляшова Кацярына Фамінічна, пад яе наглядам прайшло маё маленства. Затым усе гады свайго юнацтва я правёў у вёсцы Ліпаўка і ў Хоцімску. Тут я закончыў сярэднюю школу, адсюль пастулаў у Магілёўскі газетны тэхнікум. Пасля заканчэння яго зноў вярнуўся на радзіму і больш года, да паступлення ў інстытут журналістыкі, працаваў адказным сакратаром раённай газеты "Калгасная звязда".

Танк, але раўняцца на цудоўных майстроў слова заўсёды трэба.

І вось перада мной на стале ляжыць тая кніжачка, якая і была ў руках майго земляка-паэта. Гэта – "Віленскі календар" за 1910 год, які адным толькі экземплярам захоўваўся ў нашай Нацыянальнай бібліятэцы. Мне пад распіску далі

Радзькі, заваладаў сэрцам яго дачкі-прыгажуні. І далей склаўся лёс так, што яна стала яго жонкай, ён перавёз яе з Сожа ў вярхоўе сваёй роднай Бесядзі і тут пабудаваў маёнтак, назваўшы яго імем сваёй любімай жонкі – маладой княгіні Хоці, Хацім'і. Адсюль і пайшла назва княжыцкага маёнтка, затым мястэчка – Хоцімск.

Здаецца, вельмі просты, незамысловаты сюжэт. Але ў паданні шмат такіх карцін прыроды, такіх фактаў і падзей у жыцці, якія проста самі просяцца на паперу, каб надаць ім яшчэ больш яскравых фарбаў у мастацкім апісанні, у паказе тых вобразаў, якія кранаюць душу, прыводзяць у захапленне паводзінамі людзей, іх звычкамі і манерамі, вядомымі з даўніх часоў існавання нашай роднай Беларусі.

У навеле Е. Радзіміча ёсць адна самая цікавая дэталь – маладая прыгажуня, князёўна Хоці была незвычайна таленавітай спявачкай, шмат ведала народных песень і спявала іх у карагодзе сваіх сяброваk – простых сялянак, з якімі

зямлі, на якой жылі нашы продкі, якая дасталася нам у спадчыну. Усё гэта наша, хоць далёкая, але блізкая сэрцу гісторыя.

Праца над гэтым творам працягвалася некалькі гадоў. Але назва яго выкрышталізавалася з першых напісаных радкоў – "Дар князёўны".

Прапаную сваім землякам – чытачам газеты "Шлях Кастрычніка" урыўкі з паэмы.

### ДАР КНЯЗЁЎНЫ

*Урывак з паэмы*

Не можа быць мясцовасць
безназоўнай,
Як і жыхар яе жыць без імя.
Была даўно калісьці ў нас
князёўна
З прыгожым, дзіўным імем –
Хацім'я.
Не паскупілася сама прырода,
Каб падарыць ёй больш красы
сваёй:
Ад яркіх красак, зорак, сонца
ўсхода
І ад вясны, што вее цеплынёй.
Паданне кажа: шчэ

Дзе некалі гудзела паляванне,–
Ля Бесядзі магілкі побач іх.
А ён? Яго каханне не завяне,–
І прывядзе зноў да мясцін сваіх.
Ён вернецца з князёўнай
маладою,
Якую называюць Хацім'ёй.
Час будзе — па-над
Бесяддзю-ракою
Ён з жонкай выйдзе ўжо
на бераг свой.

* * *

Свая для Лады зорка не
знянацку
Зайскрылася на маладым вяку.
Для Лады стаў князь гомельскі за
бацьку,
Аддаўшы за яго сваю дачку.
І жыць сям"я на новым месцы
стала,
Сваю тут гаспадарку завяла.
Але аднойчы Хацім'я спытала:
– Чаму царква ў нас
у зямлю ўрасла?
Сказала: – Мала пра сябе
мы дбаем,
Глядзім на свет, як козы
на траву,–
Прасіла мужа, каб над родным
краем
Узняць вышэй найлепшую
царкву.
І вось, калі ўжо восень наступіла,
У вёску з вёскі раптам
слых пайшоў,
Што Хацім'я на працу запрасіла
І муляраў, і цесляў з мужыкоў.
Яшчэ, сказалі, самых галасістых
У хор сабрала хлопцаў і дзяўчат.
Навокал гарадка, дзе парк
квяцісты,
Наведала нямала бедных хат.
Жадае, каб у будні і ў нядзелі
Народ паслухаць мог
царкоўны хор.
Жанок далей ад кроснаў
і кудзеляў
Жыццё само пакліча на прастор.

